*Паноў Сяргей*
ДУА «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы», Мінск, Беларусь

*Panow Syargey*
National Institute for Higher Education, Minsk, Belarus

**УДК 93/94(476)**

# СУЧАСНЫ ПАДРУЧНІК ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ XIX СТАГОДДЗЯ ЯК САЦЫЯКУЛЬТУРНЫ ФЕНОМЕН: ДЫДАКТЫЧНАЯ КАНЦЭПЦЫЯ

# MODERN HISTORY TEXTBOOK BELARUS XIX CENTURY AS A SOCIOCULTURAL PHENOMENON: DIDACTIC CONCEPT

*У артыкуле прапануецца дыдактычная канцэпцыя падручніка гісторыі, які разглядаецца як сацыякультурны феномен. Аўтарам вызначаны падыходы да праектавання зместу гістарычнай адукацыі з улікам фарміравання ў вучняў вопыту эмацыянальна-каштоўнасных адносін да гістарычных падзей Беларусі XIX стагоддзя і іх удзельнікаў. Асаблівая ўвага надаецца фарміраванню ў вучняў гістарычнай памяці і ідэнтычнасці як жыхароў Беларусі і грамадзян Рэспублікі Беларусь.*

*Ключавыя словы: гістарычная адукацыя; сацыякультурны феномен; гісторыя Беларусі; падручнік гісторыі; эмацыянальна-каштоўнасная сфера развіцця асобы.*

*The article offers a didactic concept of a history textbook, which is considered as a social and cultural phenomenon. The author defines the approaches to the design of the content of history teaching in view of the formation of the students experience emotional and value attitude to historical events in Belarus XIX century and their participants. The special attention is given to formation at learners of historical memory and identity as inhabitants of of Belarus and citizens of the Republic of Belarus.*

*Keywords: history education; social and cultural phenomenon; the history of Belarus; history book; emotional and value sphere of personality development.*

Падручнік гісторыі як сацыякультурны феномен па сваім функцыянале накіраваны на трансляцыю назапашанага беларускім соцыумам гістарычнага вопыту і нацыянальных культурных каштоўнасцей ва ўмовах грамадства транзітыўнага тыпу, што забяспечвае захаванне традыцыі ў сучаснай гістарычнай адукацыі. Падручнік у рэчышчы дзяржаўнай палітыкі ў галіне адукацыі канцэптуальна пазіцыяніруецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь як аснова школьнага навучання і фактар, які вызначае яго якасць [1, с. 10]. У розных грамадска-палітычных умовах адукацыя выступае як стабілізацыйны фактар паміж новымі

сацыяльнымі ўяўленнямі і ідэаламі папярэдніх пакаленняў, якія ўвасобіліся ў гістарычнай традыцыі [2, с. 64]. Бачанне традыцыі як фактару стабільнасці дазваляе ўлічыць сістэму традыцыйных каштоўнасцей як аснову для фарміравання зместу сучаснай гістарычнай адукацыі. Сярод такіх каштоўнасцей як канцэптаў варта абазначыць сям'ю, сяброўства, каханне, любоў да Радзімы, нацыянальную культуру (пададзены выбарачна ў парадку ранжыравання па выніках маніторынгу Нацыянальным інстытутам адукацыі асабістага развіцця і ўзроўню выхаванасці вучняў 9-х, 11-х класаў) [3, с. 13]. У якасці ідэалаў папярэдніх пакаленняў аўтарам вызначаецца беларуская нацыянальная ідэя. Пераемнасць з яе фарміраваннем дазваляе сучаснаму вучню як прадстаўніку беларускай грамадзянскай нацыі ўявіць сутнасць ідэі дзяржаўнасці Беларусі. Такая ідэя ва ўмовах замацавання дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь павінна стаць базавым канцэптам і пазіцыяніравацца як каштоўнасць у сістэме новых сацыяльных уяўленняў. Палажэнне аб пераемнасці з папярэднімі стадыямі грамадскага развіцця, распрацаванае ўкраінскім доктарам псіхалагічных навук прафесарам С. Д. Максіменка, з'яўляецца адным з атрыбутаў развіцця асобы і дазваляе вучню параўноўваць артэфакты мінулага з уласным светапоглядам [4, с. 233].

Падручнік гісторыі як сацыякультурны феномен пры рэалізацыі інавацыйнага кампанента сучаснай гістарычнай адукацыі ў сваім змястоўным кампаненце прадугледжвае прадстаўленне множнасці ўзораў сацыяльных паводзін без жорсткай суаднесенасці з якім-небудзь адзіным і загадзя вызначаным, што можа паслужыць адным з атрыбутаў развіцця асобы вучня і фактарам аптымальнага ўваходжання чалавека ў полікультурны свет. Пры гэтым мэтазгодна выкарыстаць ідэю расійскага доктара педагагічных навук прафесара А. В. Хутарскога аб навучанні з выкарыстаннем культурна-гістарычных аналагаў [5, с. 232]. Згаданая вышэй дыдактычная пазіцыя стасуецца з магчымасцю выбудоўвання вучнямі асабістай адукацыйнай траекторыі, арыентаванай на напаўненне аб'ектаў вывучэння ўласным сэнсам і асабістым зместам ва ўмовах, калі культурна-гістарычным аналагам адводзіцца роля «люстэрка». З яго дапамогай вучань параўноўвае свой суб'ектны індывідуальны вопыт і адукацыйны прадукт з існуючымі культурна-гістарычнымі аналагамі, а затым выпрацоўвае як сваё бачанне зместу аб'екта навучання, так і пазнае свае здольнасці [6, с. 8–9]. Варта заўважыць, што ў сучаснай псіхолага-педагагічнай тэорыі (расійскі доктар псіхалагічных навук прафесар Д. І. Фельдштейн) падкрэсліваецца актуальнасць стварэння ўмоў для станаўлення індывіда як культурна-гістарычнага субъекта, які будзе ўспрымаць гісторыю як сваё мінулае [7, с. 27].

Па сваім мэтавызначэнні гісторыя Беларусі XIX стагоддзя як вучэбны прадмет накіравана на фарміраванне патрыятызму і паспяховую сацыялізацыяй асобы пры яе інтэграцыі ў сучаснае сацыякультурнае

асяроддзе з улікам засваення урокаў гістарычнага мінулага, выпрацоўку каштоўнасных арыентацый і пазіцыі асобы на аснове фарміравання калектыўнай гістарычнай памяці і нацыянальнай ідэнтычнасці, звязанай з усведамленнем беларускай нацыянальнай ідэі, пачуцця гонару за дасягненні ўраджэнцаў Беларусі ў галіне навукі і культуры, літаратуры і мастацтва. У такім мэтавызначэнні ўлічана, што існуе дэфіцыт станоўчых прыкладаў – узораў для падабенства, што з'яўляецца галоўным фактарам сучаснай каштоўнаснай эрозіі (расійскі доктар гістарычных навук прафесар В. Э. Багдасаран) [8, с. 95].

Пры стварэнні аўтарскай дыдактычнай канцэпцыі падручніка па гісторыі Беларусі XIX стагоддзя былі ўлічаны тэарэтыка-метадалагічныя аспекты гістарычнай і педагагічнай навук. Тэарэтыка-метадалагічнай асновай канцэпцыі з'яўляецца культуралагічная канцэпцыя зместу адукацыі (І. Я. Лернер, В. В. Краеўскі, М. М. Скаткін) і палажэнне аб гістарычнай адукацыі як сацыяльна-культурным феномене [9, с.145–149]. Псіхолага-педагагічная аснова аўтарскай дыдактычнай канцэпцыі падручніка будуецца на канцэпце развіцця асобы і прадугледжвае магчымасць суаднясення вучнямі сваіх жыццёвых уражанняў і асабістага вопыту з прапанаванымі ўзорамі сацыяльных паводзін, якія прадстаўлены пры дапамозе мастацкіх вобразаў і выступаюць у якасці культурна-гістарычных аналагаў.

У аспекце бачання гістарычнай адукацыі як сацыякультурнага феномена аўтарам дыдактычнай канцэпцыі падручніка вызначаны прынцыпы канструявання прадметнага зместу.

*Прынцып культурна-гістарычнага асяроддзя* прадугледжвае трансляцыю і засваенне вучнямі дасягненняў прадстаўнікоў беларускага этнасу ў галіне матэрыяльнай і духоўнай культуры як сацыяльнага вопыту з вызначэннем аб'ектаў сучаснага сацыяльна-культурнага асяроддзя, якія маюць гістарычныя карані, а таксама ідэй (думак) і каштоўнасных арыентацый чалавека ў гісторыі. Згодна з дадзеным прынцыпам пры вывучэнні гістарычных падзей і характарыстыцы іх удзельнікаў найбольш эфектыўным з'яўляецца такое засваенне вучэбнага матэрыялу, пры якім актуалізуецца прадстаўленне аб магчымасці ці неабходнасці выкарыстання набыткаў духоўнай і матэрыяльнай культуры, ідэй, поглядаў, вынаходніцтваў нашых папярэднікаў у жыццядзейнасці сучаснага чалавека. Неабходнымі для засваення вучнямі бачацца менавіта тыя набыткі гістарычных асоб, якімі мы карыстаемся у сучасным культурна-адукацыйным асяроддзі, што будзе спрыяць замацаванню сувязей паміж рознымі пакаленнямі людзей. Напрыклад, магчыма выкарыстаць наступнае патрыятычнае меркаванне заснавальніка «Дэмакратычнага таварыства» Францa Савіча: *«З дзяцінства, колькі сябе памятаю, мае мары былі аб свабодзе, аб Радзіме ... Усе мы іх мець павінны, ведзь атрымалі з малаком маці, ведзь песня, якую пелі ў нашых калысак, так гучала,*

*ведзь дзецям старыя пра гэта расказвалі ... Што я магу дзеля Радзімы зрабіць ... Ведаем, што вялізныя будынкі будаваліся з малых цаглін, няхай жа кожны з нас падрыхтуе сваю цэглу і пакладзе яе на сваё месца ... маючы моцную волю, я магу ... пакласці вышэй адзін камень на карысць Радзімы нашай».* Вучням прапануецца папрацаваць з гэтым тэкстам па метадзе ключавога слова.

Пры рэалізацыі прынцыпу культурна-гістарычнага асяроддзя таксама актуалізуецца задача фарміравання ў вучняў тэрытарыяльна-культурнай ідэнтычнасці. Тэрытарыяльна-культурная ідэнтычнасць як панятце ўключае ў сябе перажываемыя і ўсвядомленыя вучнямі сэнсы культурна-геаграфічнай рэальнасці, якія фарміруюць прыналежнасць чалавека да вызначанай тэрытарыяльнай супольнасці як спецыфічнай жыццёвай прасторы. Тэрытарыяльна-культурная ідэнтычнасць таксама звязана з месцам развіцця, дзе адбываецца працэс гістарычнага жыцця чалавечых супольнасцей на вызначанай зямлі. Вучні ва ўзросце14–15 гадоў пачынаюць ставіць перад сабой пытанне аб сваім месцы ў сучасным сацыякультурным асяроддзі. Таму мэтазгодна прадставіць, як гэта месца ў грамадстве вызначалася тымі, хто жыў ва ўмовах, калі беларускія землі пасля падзелаў Рэчы Паспалітай уваходзілі ў XIX стагоддзі ў склад Расійскай імперыі. Напрыклад, кім сябе адчуваў па прыкмеце тэрытарыяльна-культурнай ідэнтычнасці ўраджэнец Беларусі славуты польскі паэт Адам Міцкевіч? Тут варта нагадаць меркаванне беларускага доктара гістарычных навук прафесара І. А. Марзалюка аб тым, што А. Міцкевіч наш славуты земляк, але не беларус па нацыянальнасці і беларусам сам сябе пры жыцці не лічыў, на краёвым (рэгіянальным) узроўні лічыў сябе літвінам, а на нацыянальным узроўні – палякам, г. зн. грамадзянінам Рэчы Паспалітай [10, с. 77]. Прынцып культурна-гістарычнага асяроддзя можа быць рэалізаваны праз прадстаўленне Адама Міцкевіча як «генія памежжа культур» і матывы роднага краю ў яго творчай спадчыне.

Прынцып культурна-гістарычнага асяроддзя на макраўзроўні, г. зн. на ўзроўні трансляцыі ідэй, магчыма рэалізаваць дзеля змястоўнага напаўнення нацыянальнай самасвядомасці вучняў з дапамогай выкарыстання нацыянальных ідэнтыфікацыйных маркераў. Напрыклад, у якасці культурна-гістарычнага аналага мэтазгодна прадставіць тэарэтычныя погляды студэнтаў – ураджэнцаў Беларусі, якія стварылі ў 1884 годзе ў Пецярбургу групоўку «Гоман». Гоманаўцы першымі заявілі пра існаванне беларускай нацыі і паставілі пытанне пра яе нацыянальную самастойнасць. Яны выступалі супраць існуючых поглядаў на беларускі народ як несамастойны і разглядалі яго «як жывую народнасць, здольную самастойна распараджацца сабой». У сувязі з гэтым заяўлялася аб законных правах беларускага народа на самастойнае і раўнапраўнае становішча ў якасці аўтаноміі ў складзе Расійскай дэмакратычнай рэспублікі. Вар-

та засяродзіць увагу вучняў на тым, што разуменне гоманаўцамі сябе як прадстаўнікоў самастойнага народа і тэарэтычнае абгрунтаванне формы будучай дзяржаўнасці Беларусі сталі сведчаннем афармлення беларускай нацыянальнай ідэі.

Трансляцыя культурна-гістарычнай спадчыны Беларусі на ўзроўні ідэі магчыма праз прадстаўленне пазіцыі Вікенція Канстанціна Каліноўскага як прыхільніка сацыяльнай справядлівасці. Варта выкарыстаць яго апошнія словы ў час прысуду аб тым, што «ў нас няма дваран – усе роўныя!». Агучаная ім ідэя аб узаемаадносінах улады і народа «Не народ для ўрада, а ўрад для народа» актуальная ва ўмовах фарміравання прававой дзяржавы ў Рэспубліцы Беларусь.

*Прынцып адзінства выхавання і навучання* арыентаваны на фарміраванне калектыўнай і індывідуальнай гістарычнай памяці вучняў. Гістарычную памяць як сацыяльна-педагагічную катэгорыю мэтазгодна разглядаць у сукупнасці тэарэтычнага, факталагічнага і ацэначнага кампанентаў зместу гістарычнай адукацыі, якія прадстаўляюць дыдактычна апрацаваны сацыяльны вопыт папярэдніх пакаленняў. Складнікамі такога вопыту з'яўляюцца як вучэбныя гістарычныя веды, так і спосабы дзейнасці, вопыт творчай дзейнасці і эмацыянальна-каштоўнасных адносін да гістарычнага мінулага і яго ўдзельнікаў, а таксама здольнасць вучняў ганарыцца дасягненнямі сваіх продкаў. Канцэпт гістарычнай памяці як прымірачай па сваіх функцыях рэалізаваны праз прадстаўленне ў вучэбным матэрыяле падручніка, прысвечаным падзеям Айчыннай вайны 1812 года на тэрыторыі Беларусі, разам з асобамі, якія змагаліся на баку Расійскай імперыі, князя Дамініка Радзівіла, які падтрымаў французскі бок, бо Напалеон паабяцаў аднаўленне Рэчы Паспалітай. Другім прыкладам можа стаць патрыятычная пазіцыя расійскага генерала Якава Пятровіча Кульнева. Выяўленне такой пазіцыі вучнямі магчыма правесці пры азнаямленні з вытрымкай з гістарычнай мініяцюры В. Пікуля «Жыццё генерала-рыцара» наступнага зместу. «…Блізіўся год 1812 … "Калі, – гаварыў ён [Кульнеў] у гэтыя дні, – паду ад мяча непрыяцельскага, то паду слаўна, бо лічу для сябе за шчасце кропляй крыві апошняй ахвяраваць абароне Айчыны!" …з трывогай аглядваючы родныя мясціны, зацягнутыя дымам ад спаленага пораху "…якая туга грызе сэрца. Ведзь гэта мая Радзіма! Непадалёку адсюль ёсць пастаялы двор у Клясціцах, дзе…радзіла мяне матушка..."». Прыкладам можа стаць пазіцыя Міхала Клеафаса Агінскага – аўтара плана аднаўлення аўтаномнага Вялікага Княства Літоўскага пад эгідай Расійскай імперыі напярэдадні вайны 1812 года. У сваёй сядзібе ў вёсцы Залессе на Смаргоншчыне ён стварыў свой знакаміты паланэз ля-мінор, які пазней атрымаў назву «Развітанне з Радзімай». Вучням прапануецца правесці ўмоўнае інтэрв'ю з дадзенай гістарычнай асобай, вызначыўшы матывы напісання паланэза і прычыны надання яму такой назвы.

*Прынцып дыскрэтнасці зместу навучання* абумоўлівае першапачатковае прадстаўленне вучэбнага матэрыялу, упарадкаванае з пункта гледжання педагагічнай мэтазгоднасці засваення вучнямі найбольш вызначальных падзей і ўчынкаў асоб – ураджэнцаў Беларусі. Так, напрыклад, у кантэксце вышэйзгаданых падзей 1812 года згадваецца ўраджэнец Віцебскай губерні Карл Андрэевіч Шыльдэра, які кіраваў работамі па ўмацаванні Бабруйскай крэпасці, дзе ў час вайны пасля жорсткіх баёў знайшлі прытулак салдаты 2-й расійскай арміі. У наступным Шыльдэр пабудаваў металічную падводную лодку-ракетаносьбіт і атрымаў у гісторыі празванне «ракетнага генерала». А яго вынаходніцтва выкарыстоўваецца і ў нашы дні пры запуску ракет, калі гучыць каманда «Запальванне».

*Прынцып антрапалагізацыі зместу навучання* абумоўлівае засваенне вучнямі зместу вучэбнага матэрыялу па алгарытме «чалавек – культура – гісторыя» пры асвятленні паводзін (учынкаў) чалавека (суайчынніка, равесніка) у канкрэтным гістарычным грамадска-палітычным і сацыяльна-культурным асяроддзі з улікам матывацыйнага кампанента гістарычнай асобы. Напрыклад, вучням прапануецца змадэляваць свае паводзіны ва ўмоўнай гістарычнай сітуацыі, уявіўшы сябе ў ролі салдата-рэкрута з беларускіх губернях у складзе расійскай арміі. У якасці праблемы абазначаюцца адносіны да выканання воінскіх абавязкаў у час ваенных падзей вайны 1812 года на тэрыторыі Беларусі. Другім прыкладам можа стаць выяўленне вучнямі пазіцыі іх равесніка 14-гадовага Адама Міцкевіча наконт верагоднай падтрымкі ваюючых бакоў у вайне 1812 года. Тут актуалізуецца праблема выбару і абгрунтаванне яго. Таксама з пункта гледжання трансляцыя традыцыйных каштоўнасцей як культурна-гістарычны аналаг будзе цікавым прыклад юнацкага кахання 19-гадовага Адама Міцкевіча і Марылі Верашчакі, якая была на год маладзейшай за яго. Паэт прысвяціў свайму каханню самыя пяшчотныя лірычныя вершы. Аб ім ён паведаміў у паэме «Дзяды».

*Прынцып адзінства змястоўнага і працэсуальнага бакоў навучання* прадвызначае рэалізацыю дзейнаснага (кампетэнтнаснага) падыходу да падрыхтоўкі вучняў праз засваенне спосабаў дзейнасці са зместам вучэбнага матэрыялу і магчымых сацыяльных практык, у тым ліку прыёмаў мадэлявання сваіх верагодных паводзін у прапанаваных гістарычных сітуацыях. Такая сітуацыя згадваецца вышэй у прыкладзе з вызначэннем пазіцыі ўраджэнца Беларусі А. Міцкевіча адносна ваюючых бакоў у падзеях вайны 1812 года на тэрыторыі Беларусі.

*Прынцып нагляднасці і даступнасці ў навучанні* ў адпаведнасці з узроставымі і псіхолага-педагагічнымі асаблівасцямі вучняў рэалізуецца праз стварэнне візуальных і мастацкіх вобразаў гістарычных падзей і іх удзельнікаў падчас прызнання права вучняў на пэўную суб'ектыўнасць у працэсе першапачатковага засваення зместу вучэбна-

га матэрыялу з далейшай карэляцыяй з боку настаўніка. У дадзеным выпадку ізноў жа можна спаслацца на вызначэнне вучнямі самасвядомасці маладога А. Міцкевіча. Яго вобраз як своеасаблівае люстэрка дазваляе вучням – амаль аднагодкам маладога паэта – адчуць сваю тэрытарыяльна-культурную ідэнтычнасць праз азнаямленне з твочасцю, жыццёвым лёсам і гісторыяй кахання славутага земляка. Пры гэтым у вучняў актуалізуецца вопыт фарміравання эмацыянальна-каштоўнасных адносін да зместу вывучаемага матэрыялу. У сучасных практыках стварэння зместу вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі такі вопыт фарміравання пачуццёвых адносін, якія маюць для вучняў характар асобасна значымых, амаль не ўлічваецца.

Такім чынам, у сучаснай гістарычнай адукацыі падручнік гісторыі Беларусі XIX стагоддзя як сацыякультурны феномен забяспечвае трансляцыю гістарычнага вопыту на аснове азнаямлення з традыцыйнымі каштоўнасцямі беларускага грамадства і разам з тым спрыяе працэсу ідэнтыфікацыі вучняў як жыхароў Беларусі і грамадзян Рэспублікі Беларусь на аснове пераемнасці з працэсам выспявання беларускай нацыянальнай ідэі, якая пераўтварылася ў сучасных умовах у светапоглядную аснову ідэалогіі беларускай дзяржаўнасці.

У дыдактычнай канцэпцыі падручніка па гісторыі Беларусі ўлічваецца мэтазгоднасць фарміравання ў вучняў гістарычнай памяці праз ідэнтыфікацыю ім сябе як нашчадка той культурна-гістарычнай спадчыны, што пакінулі айчынныя дзеячы гісторыі і культуры. У працэсе фарміравання гістарычнай памяці ў вучняў выпрацоўваецца нацыянальная ідэнтычнасць. Яна ўяўляе сабой канкрэтную эмацыянальна-псіхалагічную, палітыка-ідэалагічную і культурную пазіцыю асобы, што праяўляецца ва ўспрыняцці і ідэнтыфікацыі сябе ў навакольным асяроддзі з пункта гледжання прадстаўніка сучаснай беларускай нацыі, якая мае глыбокія гістарычныя карані. Дыдактычная канцэпцыя падручніка прадугледжвае суаднясенне ўзораў гісторыка-культурнай спадчыны і сацыяльных паводзін удзельнікаў падзей з жыццёвым вопытам вучняў, трансфармацыю кагнітыўнага зместу адукацыі ў эмацыянальнае становішча пазнаючага суб'екта.

Асаблівую ўвагу ў сучасным адукацыйным сацыякультурным асяроддзі варта надаць фарміраванню вобразаў гістарычных персанажаў, ацэнцы вынікаў іх дзейнасці, што можа быць звязана з эмпатыяй (суперажываннем) вучняў у працэсе засваення імі як ідэй, так і дасягненняў у галіне культуры. Выкарыстанне менавіта вобразаў як уяўленняў, створаных мастацкімі сродкамі, дазваляе наблізіць гісторыю да ўласнага ўспрымання вучнямі, убачыць пачуцці, матывы паводзін людзей, якія жылі ў мінулым, і, такім чынам, прысвоіць вучэбныя гістарычныя веды ў якасці асобасна запатрабаваных і блізкіх да свайго эмацыянальнага стану.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. *Лукашенко, А.* «Мы вместе должны сделать белорусскую школу луч-шей в мире». Выступление Президента Республики Беларусь на Республиканском педагогическом совете / А. Лукашенко // Беларуская думка. – 2017. – № 9. – С. 3–13.

2. *Бордовская, Н. В.* Педагогика: учеб. пособие / Н. В. Бордовская, А. А. Реан. – СПб.: Питер, 2011. – 304 с.

3. *Жоголь-Лабзеева, И. П.* Особенности формирования нравственной культуры учащихся / И. П. Жоголь-Лабзеева // Адукацыя і выхаванне. – 2016. – № 11. – С. 9–17.

4. *Максименко, С. Д.* Источники и движущие силы жизненой энергии (нужды) личности / С. Д. Максименко // Мир психологии. – 2013. – № 4. – С. 213–224.

5. *Хуторской, А. В.* Дидактика: учебник для вузов. Стандарт третьего поколения / А. В. Хуторской. – СПб.: Питер, 2017. – 720 с.

6. *Король, А. Д.* Эвристический практикум по педагогике: учеб.-метод. пособие / А. Д. Король, А. В. Хуторской, Е. И. Белокоз. – Гродно: ГрГУ, 2014. – 193 с.

7. *Фельдштейн, Д. И.* Взаимосвязь теории и практики в формировании психолого-педагогических оснований организации современного образования / Д. И. Фельдштейн // Адукацыя і выхаванне. – 2011. – № 7. – С. 19–29.

8. *Багдасарян, В. Э.* Проблема методологии формирования школьного учебника истории нового типа / В. Э. Багдасарян // Контуры глобальных трансформаций: политика, экономика, право. – 2013. – Т. 6, № 2(28). – С. 92–104.

9. Теоретические основы содержания общего среднего образования / под ред. В. В. Краевского, И. Я. Лернера. – М.: Педагогика, 1983. – 352 с.

10. *Марзалюк, І. А.* Фальшывая гісторыя – маці фальшывай палітыкі / І. А. Марзалюк // Беларуская думка. – 2010. – № 7. – С. 72–79.

**(Дата паступлення: 22.09.2017).**